**УДК 72.03.246:726(476.5)**

# ХРАМЫ ПРАПАДОБНАЙ ЕЎФРАСІННІ Ў ПОЛАЦКАЙ ЕПАРХІІ: ПАРАЎНАЎЧЫ АНАЛІЗ УМОЎ ІСНАВАННЯ І РАЗВІЦЦЯ

***Г.М. ЛАБОХА***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*Параўнаўчы аналіз датычыцца Свята-Еўфрасіннеўскай царквы ў в. Бароўка Верхнядзвінскага р-на і ўласна Еўфрасіннеўскай, інакш «Цёплай», царквы, што была пабудавана ў межах архітэктурнага ансамбля Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага жаночага манастыра. Праведзены параўнаўчы аналіз існавання і дзейнасці вызначаных храмаў у рэтраспектыве часу. Разгледжаны кампазіцыйна-мастацкія характарыстыкі і асаблівасці канструкцыйнага вырашэння храмаў. Вызначаны тагачасныя стылявыя напрамкі і ступень іх уплыву на знешнюю архітэктуру і планіровачную арганізацыю храмавых помнікаў. Раскрыты ўмовы і спецыфіка існавання помнікаў сакральнага дойлідства. Паказана дваістасць стаўлення савецкіх органаў дзяржаўнага кіравання да Рускай Праваслаўнай Царквы на прыватным прыкладзе іх адносін да Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра і Свята-Еўфрасіннеўскай царквы ў в. Бароўка. Для больш дэталёвага параўнаўчага аналізу тагачаснай эпохі ў жыцці манастырскага комплекса прыведзены кароткі экскурс яго сучаснага становішча.*

**Уводзіны.** Апрацаваны аб'ём архіўных матэрыялаў і дадзеных энцыклапедычных выданняў сведчыць на карысць таго факта, што ў гонар беларускай асветніцы прападобнай Еўфрасінні ў сучасных межах Полацкай епархіі было ўзведзена пяць цэркваў. Абапіраючыся на гэты колькасны паказчык, можна сцвярджаць аб наяўнасці ў Полацкай епархіі шырока распаўсюджанага культу Еўфрасінні – мясцовай заступніцы праваслаўных вернікаў. Такім чынам, помнікі сакральнага дойлідства, прысвечаныя Еўфрасінні Полацкай, з'яўляліся своеасаблівай формай матэрыяльнай падзякі і духоўнага шанавання памяці аб жыцці і дзейнасці прападобнай ігуменні. На жаль, не ўсе храмы Еўфрасінні з моманту пабудовы прайшлі выпрабаванні часам і захаваліся да аснавання скляпенняў.

Параўнаўчы аналіз датычыцца Свята-Еўфрасіннеўскай царквы ў в. Бароўка Верхнядзвінскага раёна (мал. 1) і ўласна Еўфрасіннеўскай, інакш «Цёплай», царквы (мал. 2), што была пабудавана ў межах архітэктурнага ансамбля Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра.



Мал. 1. Свята-Еўфрасіннеўская царква (в. Бароўка)



Мал. 2. Свята-Еўфрасіннеўская царква (г. Полацк)

Вызначаныя намі цэрквы прападобнай Еўфрасінні з шэрагу ёй прысвечаных адзіныя, якім пашчасціла захавацца. Мэта дадзенага артыкула – правесці паралелі паміж умовамі і спецыфікай станаўлення, існавання і дзейнасці двух такіх храмаў у рэтраспектыве часу.

**Асноўная частка.** Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр, прылічаны ў 1842 годзе да першага класа, пачаў атрымліваць добрае штогадовае матэрыяльнае забеспячэнне агульным коштам у 3 370 руб. Дзяржаўная падтрымка ў сукупнасці з іншымі крыніцамі даходу аднаўленага манастырскага комплексу спрыяла яго далейшаму станаўленню і актыўнаму развіццю [25, с. 253]. У 1847 годзе пры ігуменні Клаўдзіі (Шчапаноўскай) (1842 – 1853 гг.) была ўзведзена «Цёплая» царква [20, с. 27]. У сваю чаргу дакладны час узвядзення Свята-Еўфрасіннеўскага храма ў в. Бароўка канчаткова не высветлены, а само пытанне датавання пабудовы застанецца на ўзроўні гіпотэз, пакуль не будзе прааналізаваны ўвесь комплекс гістарычных крыніц. На наш погляд, гіпотэза краязнаўцы А. Маладзечкіна аб заснаванні храма ў межах 1840 – 1844 гадоў з'яўляецца найбольш верагоднай і не супярэчнай [26, с. 68]. У якасці доказа можна прывесці той факт, што ў 1889 годзе непасрэдна каля царквы была збудавана драўляная пад саламянай страхой аднакласная царкоўна-прыхадская школа, якая дзейнічала да рэвалюцыі 1917 года.

Звернемся да кампазіцыйных адметнасцей і функцыянальнага прызначэння Еўфрасіннеўскага храма ў планіровачнай структуры манастыра св. Спаса. Размешчаны з правага (паўднёвага) боку Спаса-Праабражэнскай царквы будынак прызначаўся для правядзення набажэнстваў у халодную пару года. Першапачатковае архітэктурна-мастацкае вырашэнне «Цёплай» царквы па сваёй прастаце і адсутнасці стылевых нюансаў нагадвала гаспадарчыя памяшканні ў забудове манастырскага ансамбля. Бадай што толькі крыж з’яўляўся адметным знакам храма. І толькі пасля правядзення рамонтных работ у 1886 годзе будынак набыў больш яўнае аблічча сакральнага помніка – да яго прыбудавалі прытвор і рызніцу. Прамавугольны ў плане, мураваны храм Еўфрасінні быў накрыты двухсхільным дахам, у цэнтры якога размяшчаўся невялікі купал з галоўкай на драўляным васьміграннім барабане. Уваход у «Цёплую» царкву быў вырашаны пры дапамозе арачнага партала з шырокай лесвіцай. Сцены збудавання былі расшыты па тынку пад квадратную муроўку, паўцыркульныя аконныя праёмы аздоблены руставанымі ліштвамі [17, с. 41].

Капітальныя выпраўленні ў царкве прападобнай Еўфрасінні таксама праходзілі ў 1887 і 1898 гадах. Падчас апошняга рамонту быў дабудаваны алтар. Пяцігранная апсіда (з усходу) вылучана шырокім арачным парталам і аднаярусным іканастасам. Унутраная прастора «Цёплай» царквы была перакрыта карабавым драўляным скляпеннем і дапоўнена драўлянай галерэяй хораў. Толькі напрыканцы XIX стагоддзя інтэр’ер храма набывае канчатковую завершанасць і суладнасць форм [18, с. 125].

Звернемся да функцыянальнага прызначэння Бароўскага храма прападобнай Еўфрасінні, які з даўніх часоў называюць пагостам. З левага (паўночнага боку) ад храма з моманту яго заснавання знаходзяцца могілкі, дзе былі пахаваны прадстаўнікі як праваслаўнай, так і рымска-каталіцкай канфесій. Надмагільныя пліты і крыжы першай паловы XX стагоддзя дасюль захоўваюць сляды лацінскіх і польскіх эпітафій. Храм быў разлічаны на 300 чалавек. Агульнавядома, што храмы будуюцца з улікам колькасці прыхаджан. Можна меркаваць, што прыход у Бароўскай царкве, у які акрамя цэнтра ўваходзіла 12 вёсак і адзін маёнтак, быў значны і складаўся галоўным чынам з малапісьменных сялян [19, с. 125].

Бароўскі храм быў спраектаваны ў выглядзе цаглянага на мураваным цокалі і падмурку будынка. Знадворку і ўнутры сакральны будынак быў атынкаваны і падфарбаваны вадзяной фарбай. Унутраныя панэлі пафарбаваны алейнай фарбай. Да асноўнай часткі пабудовы дапасоўвалася званіца, разбітая на два ярусы. Царкву ўвенчвала вялікая галава на драўляным барабане з імітаванымі аконнымі праёмамі. Фасады будынка чляніліся дзесяццю аконнымі праёмамі [16, с. 220].

У той час, калі аб’ёмна-прасторавая кампазіцыя «Цёплай царквы» захавалася да нашага часу без грунтоўных змяненняў, сучасны стан Бароўскага храма перадусім сведчыць аб неаднаразовых зменах яго першапачатковага аблічча ў выніку шматлікіх перабудоў. Навацыі ў архітэктурным вырашэнні помніка з’яўляліся непасрэдным вынікам яго чарговага «функцыяныльнага прызначэння»: толькі за гады савецкай улады ў будынку царквы ў розныя часы размяшчаліся збожжасховішча, сельскі клуб і склад будаўнічых матэрыялаў. Так, на сучасны момант храм упрыгожваюць два невялікія купалы: адзін завяршае трох’ярусную званіцу, другі размешчаны на цэнтральным васьміграннім барабане. Колькасць аконных праёмаў, размешчаных на фасадах будынка ў два ярусы, зменшылася ўдвая. На месцы былых акон, завершаных дэкаратыўнымі паўцыркульнымі броўкамі, засталіся замураваныя паўцыркульныя нішы. Вежападобная званіца, а таксама цагляны барабан таксама аздоблены ўжо не імітаванымі, а сапраўднымі вокнамі паўцыркульнай формы, якія па свайму размеру ўдвая меншыя за вокны ніжэйшага яруса.

Уплыў гістарычных рэалій на дзейнасць і функцыянальнае прызначэнне разглядаемых намі цэркваў не быў аднолькавым для абодвух храмавых пабудоў. Полацкая Свята-Еўфрасіннеўская царква ў першую чаргу з’яўлялася архітэктурным кампанентам у забудове манастыра, дзе дамінуючая роля безумоўна належыла Спаса-Праабражэнскай царкве. Агульнае становішча манастырскага комплексу ў цэлым прадвызначала становішча, развіццё і якаснае функцыянаванне яго складаючых. Такім чынам, гісторыя «Цёплай» царквы непарыўна звязана з гісторыяй забудовы і планавання ўсяго архітэктурнага ансамбля жаночага манастыра.

Напрыканцы XIX стагоддзя Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр пад кіраўніцтвам ігуменні Яўгеніі (Гаваровіч) (1879 – 1900 гг.) дасягнуў асаблівага росквіту. На тэрыторыі манастырскага комплексу працягваецца актыўнае будаўніцтва новых гаспадарчых памяшканняў і рамонтна-рэстаўрацыйныя работы старых будынкаў, у тым ліку і «Цёплай» царквы (1886, 1887, 1898).

Пасля кастрычніка 1917 года палітыка дзяржавы ў адносінах да Царквы кардынальна змянілася. Дэкрэтам СНК ад 20 студзеня 1918 года Царква адмяжоўвалася ад Дзяржавы, а ўся царкоўная маёмасць абвяшчалася «народным достоянием» [23, с. 7]. Пачалася рэквізіцыя царкоўных каштоўнасцей, якая праводзілася, па афіцыйнай версіі, у мэтах арганізацыі дапамогі галадаючым Паволжа [22, с. 84].

Спаса-Еўфрасінеўскі манастыр быў зачынены ў 1928 годзе (па некаторых дадзеных, у межах 1924 г.) [24, с. 153]. У год закрыцця лік насельніц перавышаў 200 чалавек. Пасля выгнання з манастыра інакіні былі вымушаны пасяліцца на лясных высечках каля станцыі Гараны, дзе пабудавалі жыллё і малельню для правядзення набажэнстваў. Часам яны прыходзілі да Спаса-Праабражэнскага храма, які адзіны дзейнічаў ва ўсёй акрузе. З 1925 года тут праводзілі набажэнствы так званыя абнаўленцы [20, с. 72].

З 1928 па 1941 год на тэрыторыі манастырскага комплексу размяшчаліся вайсковыя часткі. У былых келейных карпусах былі размешчаны кватэры для ваеннаслужачых. Астатнія манастырскія збудаванні («Цёплая» царква не выключэнне) ператвораны ў гаспадарчыя склады і майстэрні. Надбрамная званіца была зруйнавана, а разам з ёй мясцовыя ўлады загадалі ліквідаваць і манастырскія могілкі.

Ва ўнутрыцаркоўным жыцці Бароўскага храма таксама назіраўся сур'ёзны разлад: атэістычная прапаганда і стварэнне невыносных умоў існавання для Бароўскай рэлігійнай абшчыны і яе актыўных прыхаджан («религиозных фанатиков») паскорыла яго закрыццё ў сярэдзіне 1930-х гадоў. З усёй царкоўнай маёмасці Бароўскай Свята-Еўфрасіннеўскай царквы захаваліся толькі абраз Божай Маці і выява прападобнага Ніла Салунскага. Царкоўныя рэліквіі, якім пашчасціла пазбегнуць канфіскацыі, з пакалення ў пакаленне руплiва захоўваліся карэннымі жыхарамі вёскі амаль да часоў аднаўлення храма.

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны, каб прыцягнуць на свой бок мясцовае насельніцтва, нямецкія акупацыйныя ўлады далі дазвол на адкрыццё цэркваў, манастыроў і іншых культурных устаноў. Хоць Бароўскі храм быў па-ранейшаму зачынены, з 1942 года сваю дзейнасць распачаў Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр (афіцыйны дазвол на адкрыццё быў атрыманы ад германскіх улад толькі 21 кастрычніка 1943 г.). Былыя насельніцы манастыра, якія дагэтуль туліліся па пуням, лазням, хаваліся ў лесе, вярталіся да яго з дазволу акупацыйных улад.

Падчас нямецка-фашысцкай акупацыі частка тэрыторыі манастырскага комплексу, якая знаходзілася ў левым баку ад Свята-Крыжаўзвіжанскага сабора, уключаючы і сам сабор, і царкву прападобнай Еўфрасінні, была абнесена калючым дротам, за якім размяшчаўся лагер савецкіх ваеннапалонных [17, с. 18].

У першыя пасляваенныя гады мясцовыя ўлады не перашкаджалі паступоваму адраджэнню манастыра св. Спаса. Пасля смерці ігуменні Ананіі, якая кіравала манастыром у гады вайны, яе пераемніцай стала Елеўферыя (Новікава). Менавіта за перыяд руплівага кіраўніцтва (194(?) – 1959 гг.) новай ігуменні ў 1949 годзе атрымалася адрамантаваць на ўласныя грошы Спаса-Праабражэнскую царкву (быў узведзены новы жалезны дах, праведзены дробныя касметычныя работы) [13, л. 8].

Астатнім помнікам архітэктурнага ансамбля таксама былі патрэбны рамонтна-рэстаўрацыйныя работы: настаяцельніца неаднаразова прасіла дазволу ў гарадскога кіраўніцтва адрамантаваць Свята-Крыжаўзвіжанскі сабор і «Цёплую» царкву [14, л. 8]. Прычым у сваіх зваротах ігумення не прасіла выдаткаваць неабходныя сродкі, бо спадзявалася на матэрыяльную дапамогу мітрапаліта [126, с. 4]. Тым не менш улады не пагаджаліся на пачатак будаўнічых работ. На іх погляд, усе манастырскія помнікі, за выключэннем сусветна прызнанага храма Спаса Праабражэння, не ўяўляюць гісторыка-культурнай каштоўнасці і таму не заслугоўваюць матэрыяльных выдаткаў на іх аднаўленне.

Бароўскаму храму прападобнай Еўфрасінні партыйныя колы таксама адмовілі ў архітэктурна-мастацкай адметнасці. З 1949 года плошча пустуючага храма была прызначана пад нарыхтовачны склад мясцовай канторы «Заготзерно». Каб ператварыць храмавую плошчу ў складское памяшканне, быў праведзены рамонт. Якасць будаўнічых работ у былым храме не задаволіла мясцовае кіраўніцтва: крыху падлатаны дах па-ранейшаму прапускаў атмасферныя ападкі, на аконных праёмах не былі ўсталяваны жалезныя краты. Згодна архіўным дадзеным, адказныя работнікі нарыхтовачнага пункта нярэдка атрымоўвалі негатыўную адзнаку іх дзейнасці па захаванню дзяржаўнага хлеба. На наш погляд, аб'ектыўнай прычынай вільготнага, заражанага кляшчом і даўганосікам збожжа з'яўляецца няўдалы касметычны рамонт будынка і яго першапачатковае функцыянальнае прызначэнне, не прыдатнае для якаснай работы тэхнічнага абсталявання. Выкарыстанне плошчы былога храма пад збожжасховішча працягвалася нядоўга: рашэннем Дрысенскага раённага Савета дэпутатаў з 1954 года будынак Бароўскага храма быў прыстасаваны пад сельскі клуб. Прымая да ўвагі той факт, што будынак знаходзіўся не ў лепшым стане пасля яго актыўнага выкарыстання ў якасці збожжасховішча, мясцовае кіраўніцтва выдаткавала значную суму грошай (20 тыс. руб.) і 60 куб. м драўніны на капітальны рамонт будучага клуба. Старшыня выканкама Віцебскага Аблсавета тав. М. Парашчанка нават даў загад аб паскарэнні будаўніча-рамонтных работ па абсталяванню клуба пад дахам былой царквы [7, л. 95]. Каб дэсакралізаваць богаслужбовае памяшканне і неяк прыстасаваць яго да атрыманага статусу клубнай установы, была знішчана алтарная частка. Адмежаваная ад асноўнай частцы сакральная прастора храма ператварылася ў сцэнічную плошчу, дзе ладзіліся канцэртныя праграмы, гульні, лекцыйныя мерапрыемствы і г.д. [6, л. 171]. Падлога храма дасюль з'яўляецца маўклівым сведкам танцавальных вечарын: на яе дошках захаваліся кропкавыя адбіткі абцасаў моладзі. У межах алтарнай прасторы зручна ўладкаваўся канцэртны рэквізіт з лектарскай трыбунай, адкуль праводзілася мэтанакіраваная прапаганда атэізму.

У сваю чаргу дзейнасць Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра працягвалася. У 1955 годзе ігумення Елеўферыя звярнулася да ўпаўнаважанага па справах РПЦ па Віцебскай вобласці тав. Сідарава з просьбай дазволіць адрамантаваць і надалей карыстацца «Цёплай» царквой. Ад царквы засталася прамавугольная цагляная каробка, не пакрытая дахам. Па словах настаяцельніцы, рамонт будынка будзе каштаваць нашмат танней за пабудову новага. У аднаўленым храме планавалася зрабіць старожку для аховы манашкамі Спаса-Праабражэнскай царквы і ўласна манастырскага жылога корпуса. У межах храма-

вага будынка таксама планавалася адвесці неабходную плошчу для правядзення рэлігійнага абраду хрышчэння немаўлят у халодную пару года, бо Спаса-Праабражэнскі храм не ацяпляўся [1, л. 22]. На наш погляд, запланаванае выкарыстанне будынка царквы ў якасці старожкі з'яўлялася стратэгічным крокам з боку ігуменні для адраджэння помніка хоць на такіх умовах.

Паступовае супрацьстаянне Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра і мясцовых органаў выканаўчай улады, якое рабілася ўсё больш відавочным, перашкодзіла аднаўленню Свята-Еўфрасіннеўскай царквы ў межах манастырскага комплексу нават пад выглядам старожкі. Дарэчы тагачасныя яго межы былі даволі ўмоўнымі: на тэрыторыі манастыра побач з манашкамі пражывалі і грамадзянскія асобы, якія займалі большую частку жылых і гаспадарчых памяшканняў. Уваход быў свабодны і для чужой публікі.

Напрыканцы 1950-х гадоў пачалі гучаць настойлівыя прапановы аб зачыненні манастыра, якія паступалі ў гарвыканкам. Ігумення Елеўферыя рабіла ўсё магчымае, каб перашкодзіць закрыццю манастыра. У 1956 годзе яна звярнулася да рэспубліканскіх улад з хадайніцтвам распачаць рамонт Крыжаўзвіжанскага сабора, каб перадаць яго Спаскаму манастыру. У чарговы раз настаяцельніца атрымала кароткую і разам з тым безапеляцыйную адмову: «монахиням вполне достаточно для молений имеющейся у них церкви» [13, л. 8]. Сабор у гонар «Вседержителя» быў заняты пад свіран для зерня і іншых сельскагаспадарчых рэчаў, а пасля выконваў прызначэнне падсобнага памяшкання для жыльцоў камунальных дамоў. Гэта ў той час, калі Спаса-Праабражэнскі храм быў адзіны, які не спыняў сваёй дзейнасці ва ўсім Полацку і яго ваколіцах. Дарэчы, упаўнаважаны Савета па справах Рускай Праваслаўнай Царквы Полацкай вобласці Л.К. Маркоўскі адзначаў пазней у сваіх данясеннях: «Нельзя ли через осмотр технической комиссии установить, что здание собора угрожает обвалом и с последующей санкции Совета по делам РПЦ снести его» [13, л. 8].

Як было ўзгадана вышэй, неабходныя рамонтна-рэстаўрацыйныя работы па аднаўленню помнікаў не планаваліся гарадскімі ўладамі. На іх погляд, «Цёплая» царква, як і Крыжаўзвіжанскі сабор, не прадстаўлялі вялікай гісторыка-культурнай каштоўнасці [2, л. 71]. Адзінае, што прываблівала членаў гарвыканкама ў архітэктурна-мастацкім вырашэнні сабора Крыжаўзвіжання, – яго ўмяшчальны аб'ём, разлічаны на 1,5 тыс. чалавек. Ва ўмовах неабходнасці правядзення больш актыўнай навукова-атэістычнай прапаганды ўлады вырашылі скарыстаць гэту зручную асаблівасць помніка. У сакральным будынку пасля правядзення належных рамонтных работ планавалася адчыніць планетарый [4, л. 55]. У сваю чаргу, «Цёплую царкву» было вырашана заняць пад музей помнікаў старажытнарускага мастацтва.

Далей, у 1958 годзе, у Савецкім Саюзе распачаўся новы перыяд «штурма небес», які скончыўся адстаўкай М.С. Хрушчова ў 1964 годзе. За невялікі прамежак часу была зачынена палова ўсіх храмаў Рускай Праваслаўнай Царквы. У 1960 годзе манастыр св. Спаса быў зняты з рэгістрацыі і ў чарговы раз перастаў існаваць. Адначасова з закрыццём Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра распачаўся працэс закрыцця храмаў. Толькі за 1961 год 10 цэркваў Віцебскай вобласці былі зачынены [23, с. 67]. Вядома, што органы дзяржаўнага кіравання неаднаразова імкнуліся спыніць дзейнасць Спаса-Еўфрасіннеўскага манастырскага комплексу. Толькі дзякуючы хадайніцтву Свяцейшага Патрыярха Алексія І, які падтрымліваў ігуменню Елеўферыю, манастыр здолеў «пратрымацца» да 1960 года. Пасля смерці настаяцельніцы ў кастрычніку 1959 года кіруючым структурам ужо нішто не замінала зачыніць манастыр. Афіцыйнай прычынай, на якую яны спасылаліся пры забароне далейшай дзейнасці манастыра, было яго «антысанітарнае становішча і шкодніцкі ўплыў на выхаваўчую работу сярод моладзі». Разам з тым выканкам гарсавета меў намер размясціць мошчы прападобнай Еўфрасінні ў Полацкім гісторыка-краязнаўчым музеі, каб самі манастырскія памяшканні надалей бесперашкодна выкарыстоўваць у якасці будынкаў для дзіцячых устаноў [5, л. 25].

Насельніцам Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра прапанавалі пераехаць у Жыровіцы, што пад Мінскам. Гэтыя ўмовы прынялі 11 з 50 інакінь і згадзіліся пераехаць, астатнія сёстры, як і ў 1920-я гады, размясціліся недалёка ад Спаскага манастыра [20, с. 43]. Нягледзячы на здзекі з боку мясцовых улад, яны амаль штодзень прыходзілі на малітву да святых мошчаў Еўфрасінні. У храме Спаса Праабражэння працягвалі таемна здзяйсняцца набажэнствы.

Непасрэдна пасля зачынення манастырскага комплексу на тэрыторыі архітэктурнага ансамбля спрабавалі ўладкаваць далёка не дзіцячыя ўстановы. Полацкі выканкам на чале са старшынёй М. Кляпацкай ад 19 чэрвеня 1961 года вырашыў «безвозмездно» перадаць жаночы манастыр на баланс гарадской бальніцы ім. Леніна для выкарыстання пад інфекцыйнае і скурнае аддзяленні без права забудовы тэрыторыі [10, л. 11]. Галоўнаму ўрачу гарбальніцы А.М. Палыгалінай было даручана неадкладна прыступіць да каардынацыі рамонта манастырскіх будынкаў і ўвесці ў эксплуатацыю філіял медустановы да 1 студзеня 1962 года.

У сувязі з адсутнасцю неабходных грашовых сродкаў і праектнай дакументацыі на пераабсталяванне манастырскіх памяшканняў пад лячэбныя ўстановы 13 верасня 1961 года рашэнне выканкама гарадского Савета дэпутатаў ад 19 ліпеня 1961 года было скасавана. Архітэктурныя помнікі Спаса-Еўфрасіннеўскага ансамбля былі пераведзены на баланс гарадской камунальнай гаспадаркі [11, л. 68].

Тэрыторыю былога Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, згодна даведцы Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка аб становішчы архітэктурна-археалагічных помнікаў г. Полацка ад 10 лістапада 1976 года, планавалася ўключыць у запаведную зону [3, л. 25].

Падчас закрыцця Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра былы храм прападобнай Еўфрасінні ў в. Бароўка працягваў выконваць функцыі цэнтральнага сельскага клуба. У адрозненні ад суседніх вёсак, якія час ад часу карысталіся паслугамі кінаперасовак, сельскі клуб меў уласную кінаапаратную, дзе ажыццяўляўся пастаянны паказ мастацкіх кінастужак. На хорах, шчыльна закладзеных цэглай, была ўладкавана будка кінамеханіка і мадэрновая па тым часам «двухпостная» кінаапаратура. Над алтаром навешвалі шырокую белую тканіну, перад якой расстаўлялі лавы не толькі сельскія глядачы, але і кінааматары з раёна. Трэба заўважыць, што іх колькасць у святочныя і выхадныя дні ледзь не перавышала колькасць прыхаджан на святочнай літургіі ў былыя часы [8, л. 155].

Могілкі, што знаходзіліся пры Бароўскім храме (чытай – клубе) былі абнесены трохмятровай драўлянай агароджай. Шчыльна падагнаныя адна да адной дошкі ўсё ж такі не маглі цалкам схаваць ні крыжы, ні новыя пахаванні, ні сталых людзей, якія прыходзілі да памёрлых продкаў на Дзяды ці то Троіцу. Перад уваходам у храм была збудавана летняя танцавальная пляцоўка, якая межавала побач з могілкамі.

Ці тое спецыфічны ўплыў атмасферы былога храма, ці тое асабістыя жыццёвыя абставіны, але накіраваныя ў Бароўку загадчыкі клуба доўга не затрымоўваліся пад акраплёным некалі дахам. Толькі за год з моманту адкрыцця клуба змянілася шэсць кіраўнікоў. Вядома адно – непасрэдную прычыну склаўшайся сітуацыі мясцовае кіраўніцтва ўбачыла ў асобе загадчыка аддзела культуры райвыканкама тав. Сініцы, які слаба правёў выхаваўчую работу з кадрамі культасветработнікаў [8, л. 225].

Паміж тым да сярэдзіны 1980-х гадоў ахоўна-забаронная палітыка цалкам сябе вычарпала. Увага грамадскасці была прыцягнута да праблем у галіне дзяржаўна-царкоўных адносін, якія не вырашаліся на працягу дзесяцігоддзяў, стваралі сацыяльную напружанасць у грамадска-палітычным жыцці краіны. Ідэалагічныя службы КПСС – КПБ былі пастаўлены перад фактам вострай неабходнасці пераасэнсавання праблем, а менавіта – хутчэйшага перагляду дзяржаўна-канфесійных адносін.

У 1986 годзе клубная ўстанова была зачынена па прычыне «немэтазгоднасці яе ўтрымання ў выніку пабудовы новых клубаў у суседніх вёсках» [9, л. 15]. Насамрэч прычын закрыцця ўстановы было даволі шмат. Аварыйнае становішча клуба, якому ўжо колькі год патрабаваўся сапраўдны капітальны рамонт, не прываблівала мясцовую грамадскасць сваім знешнім выглядам. Да таго ж яго інтэр'ер не мяняўся на працягу дзесяцігоддзяў: уладкаваны каля алтарнай часткі чырвоны куток атэіста і бібліятэка з наглядна-агітацыйнымі буклетамі былых часоў, як мінімум, маральна састарэлі. Не прымая да ўвагі просьбы вернікаў аб аднаўленні храма, мясцовая адміністрацыя вырашыла размясціць склад-краму прамысловых тавараў. Згодна новаму плану царква была размежавана на дзве часткі: алтарная частка была адведзена пад склад, а частка, блізкая да нартэкса, выконвала функцыі прылаўка. Пакупнікі хадзілі па царкоўнай зале, дзе былі выкладзены тавары, неабходныя для ўзвядзення і рамонту жыллёвых пабудоў, санітарна-тэхнічнага і ацяпляльнага абсталявання, а таксама інструменты для будаўнічых работ і інш. Аб размяшчэнні кассы з прылаўкам можна меркаваць па шырокай палосцы лінолеума, якая захавалася разам з драўлянай, адбітай абцасамі, падлогай да нашых часоў.

Адраджэнне ў кастрычніку 1989 года Полацкай епіскапскай кафедры садзейнічала далейшаму станаўленню Спаса-Еўфрасінеўскага манастыра, а таксама павышэнню рэлігійнасці насельніцтва і паступоваму разбурэнню атэізму. У гісторыі забудовы і планавання Спаса-Еўфрасіннеўскага манастырскага ансамбля распачаўся перыяд паступовага адраджэння архітэктурных помнікаў царкоўнага дойлідства [27, с. 77]. 4 жніўня 1990 года Савет па справах рэлігіі пры Савеце Міністраў СССР зарэгістраваў Спаса-Еўфрасіннеўскі жаночы манастыр. Па блаславенню Свяцейшага Сінода РПЦ, дадзенаму 6 ліпеня 1989 года, у Спаскім манастыры былі распачаты рамонтна-рэстаўрацыйныя работы [12, л. 3]. Напачатку адраджэння манастырскага ансамбля перад духоўным кіраўніцтвам Полацкай епархіі паўсталі шматлікія перашкоды. У той час, калі манастыр не дзейнічаў, у двухпавярховы будынак, дзе раней жылі манашкі, было паселена 27 сем'яў. Культавыя пабудовы знаходзіліся ў даволі дрэнным стане, на іх аднаўленне патрабавалася шмат грашовых сродкаў.

Агульнымі намаганнямі ў 1989 годзе быў адбудаваны Спаса-Праабражэнскі храм. Адначасова з ім адрамантавана і «Цёплая царква» (з 1991 г. – трапезны храм). У пачатку 1990 года былі скончаны рэстаўрацыйныя работы ў Крыжаўзвіжанскім саборы. Дарэчы, трэба заўважыць, што рэстаўрацыя сабора была здзейснена за вельмі кароткі тэрмін – усяго за 9 месяцаў [21, с. 28].

Такім чынам, пасля правядзення шэрагу рамонтных работ па аднаўленню Свята-Крыжаўзвіжанскага храма пачалося паступовае адраджэнне Спаса-Еўфрасіннеўскага комплексу ў цэлым.

Калі ўсе тры сакральныя помнікі манастырскага ансамбля зноў маглі дзейнічаць, улады пагадзіліся перадаць іх экзархату і даць дазвол на адкрыццё манастыра. Апошнія толькі прасілі вярнуць грошы Полацкаму гісторыка-археалагічнаму запаведніку за рамонт «Цёплай» царквы агульнай сумай у 100 тыс. руб. і выдаткаваць сродкі для будаўніцтва жылля тым людзям, што яшчэ пражывалі на тэрыторыі манастырскага комплексу, у памерах 50 тыс. руб. [11, л. 110]. Калі ўсе пазначаныя патрабаванні былі выкананы,

17 студзеня 1990 года гарвыканкам вярнуў у карыстанне жаночага манастыра тры культавыя пабудовы: Спаса-Праабражэнскую царкву, «Цёплую», або трапезную царкву, Свята-Крыжаўзвіжанскі сабор), два двухпавярховыя дамы і надбрамную званіцу [10, л. 40].

Храм прападобнай Еўфрасінні ў в. Бароўка быў вернуты праваслаўным вернікам у 1992 годзе. Будынак знаходзіўся ў даволі жудасным стане: не было іканастаса, ужо не кажучы пра рэчы царкоўнага ўжытку, разбурана званіца, пашкоджаны падлога, дах і столь храма. Такія шкодныя ўмовы, натуральна, не спрыялі захаванню помніка культавага дойлідства. З-за перманентнай вільгаці і перападаў тэмпературы не толькі зніклі драўляныя часткі, але пацярпелі і самі муры Бароўскага храма.

Безумоўна, назіраюцца і станоўчыя змяненні ў храме прападобнай Еўфрасінні, якія пакінула пасля сябе савецкая ўлада. Гэта, напрыклад, правядзенне цэнтральнага ацяплення ў будынак, падчас яго выкарыстання ў якасці складскога памяшкання. З другога боку, захаванне царквы да нашых часоў ужо станоўчы факт. У гэтым сэнсе Бароўскай царкве асабліва пашанцавала – пашкоджаныя муры сакральнага будынка аднавіць нашмат лягчэй за яго фундаменты.

**Заключэнне.** Каб вызначыць агульнае і адметнае ў гістарычным развіцці царквы ў в. Бароўка Верхнядзвінскага раёна і ўласна Еўфрасіннеўскай, інакш «Цёплай», царквы падвядзем высновы. Абодва храмы прападобнай Еўфрасінні захаваліся да нашых дзён. Больш таго, перыяд узвядзення царкоўных будынкаў практычна супадае – сярэдзіна XIX стагоддзя. Архітэктурнае вырашэнне храмаў, збудаваных па ўзорах класіцызму, мае агульныя рысы: маленькі купал на драўляным васьміграннным барабане, двухсхільны дах, прастата дэкору інтэр'ера, лагічнасць і яснасць планіроўкі. У той час, калі аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя «Цёплай царквы» захавалася да нашага часу без грунтоўных змяненняў, сучасны стан Бароўскага храма перадусім сведчыць аб неаднаразовых зменах яго першапачатковага аблічча ў выніку шматлікіх перабудоў.

Функцыянальнае прызначэнне храмаў таксама было розным. Бароўская царква-пагост прападобнай Еўфрасінні з моманту ўзвядзення з'яўлялася самастойнай царкоўнай адзінкай. Аб'ём храмавай пабудовы, разлічаны на 300 чалавек, сведчыць аб значнасці і ўплывовасці прыходу. Вясковы храм духоўна злучаў не толькі мясцовых прыхаджан, але і вернікаў прылягаючых вёсак. У сваю чаргу «Цёплая» царква была толькі архітэктурнай складаючай у ансамблі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, дзе дамінуючая роля перадусім належыла непасрэднаму твору прападобнай ігуменні – Спаса-Праабражэнскай царкве. Падкрэслены факт яскрава адлюстраваны ў прынцыпах забудовы і планавання манастыра. Да прыкладу, праектаванне велічнага белакаменнага сабору Крыжаўзвіжання прадугледжвала, каб той ідавочна ніколькі не прыглушаў сваёй масай стромкі, кампактны сілуэт царквы Спаса Праабражэння. Збудаваны ў 1897 годзе храм быццам адступае на крок перад творам дойліда Іаана, тым самым утвараючы перад ім прасторную плошчу [16, с. 17]. Такім чынам, этапы гістарычнага станаўлення і дзейнасці «Цёплай» царквы былі разгледжаны намі пры непасрэдным звяртанні да агульнага становішча манастырскага комплексу ў рэтраспектыве часу.

Гістарычны лёс храмаў пасля кастрычніцкіх падзей 1917 года таксама меў пэўныя разыходжанні па даце закрыцця ўстаноў і іх далейшага выкарыстання і функцыянальнага прызначэння. Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр за гады савецкай улады зачыняўся двойчы: у 1928 (у архіўных крыніцах можна сустрэць і 1924 г.) і 1960 гадах. Можна заўважыць, што перыяд дзеяння манастыра з часой Вялікай Айчыннай вайны да 1960 года карэнным чынам не адбіўся на становішчы ўласна «Цёплай» царквы. Шматлікія хадайніцтвы ігуменні Елеўферыі аб правядзенні запланаваных рамонтна-рэстаўрацыйных работ па аднаўленню помнікаў манастырскага комплексу былі безапеляцыйна адхілены мясцовым партыйным кіраўніцтвам. Функцыянаванне адзінай Спаса-Праабражэнскай царквы, на іх погляд, было дастатковым для патрэб манастыра. Калі ў 1949 годзе ў Спаса-Праабражэнскай царкве былі праведзены нязначныя касметычныя работы, то занядбаныя і разбураныя за гады нямецкай акупацыі сабор Крыжаўзвіжання і «Цёплая» царква з кожным годам прыходзілі ў заняпад. Ад царквы прападобнай Еўфрасінні засталася цагляная каробка з выбітымі аконнымі праёмамі. Непакрыты дах будынка прапускаў атмасферныя ападкі. Запланаваны кіраўніцтвам гарвыканкама план па пераабсталяванню былога храма ў музей старажытнарускага мастацтва застаўся на паперы. Так, да 1989 года «Цёплая» царква заставалася часовым прытулкам бадзяг і месцам захоўвання гаспадарчых прылад.

У сваю чаргу зачынены ў сярэдзіне 1930-х гадоў будынак царквы прападобнай Еўфрасінні ў в. Бароўка ў розныя часы быў заняты пад збожжасховішча (1949 – 1954), клуб (1954 – 1986) і складкраму будаўнічых матэрыялаў (1986 – 1991). Прымая да ўвагі той факт, што былы храм знаходзіўся не ў лепшым стане пасля яго актыўнага выкарыстання ў якасці зернесклада, мясцовае кіраўніцтва выдаткавала значную суму грошай (20 тыс. руб.) і 60 куб. м драўніны на капітальны рамонт будучага клуба. Такім чынам, Бароўскі помнік храмавага дойлідства не пуставаў, на працягу дзесяцігоддзяў існавання клуба у будынку праводзіўся шэраг рамонтна-аднаўленчых работ.

Час адкрыцця царкоўных устаноў быў амаль аднолькавым. Пасля пераадолення юрыдычнай цяганіны 4 жніўня 1990 года. Савет па справах рэлігіі пры Савеце Міністраў СССР зарэгістраваў Спаса-Еўфрасіннеўскі жаночы манастыр. У 1992 годзе Бароўская царква была перададзена праваслаўным вернікам.

Рэлігійнае жыццё на тырыторыі Полацкай епархіі працягваецца нягледзячы на былыя рэпрэсіўныя захады, знішчэнне храмаў і моцны ідэалагічны ўціск. Спустошаныя за гады савецкай улады цэрквы прападобнай Еўфрасінні здолелі перажыць выпрабаванне часам, каб пад яе аховай працягваць сваю духоўную дзейнасць на сучасным этапе.

ЛІТАРАТУРА


1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей ДАВВ). – Фонд 4131. – Воп. 2. – Спр. 10.
2. ДАВВ. – Фонд 4131. – Воп. 2. – Спр. 14.
3. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку (далей ЗДА у г. Полацку). – Ф. 51. – Воп. 1. – Спр. 91.
4. ЗДА у г. Полацку. – Фонд 54. – Воп. 1. – Спр. 343.
5. ЗДА у г. Полацку. – Фонд 86. – Воп. 1. – Спр. 61.
6. ЗДА у г. Полацку. – Фонд 129. – Воп. 2. – Спр. 107.
7. ЗДА у г. Полацку. – Фонд 129. – Воп. 2. – Спр. 121.
8. ЗДА у г. Полацку. – Фонд 129. – Воп. 2. – Спр. 847.
9. ЗДА у г. Полацку. – Фонд 658. – Воп. 6. – Спр. 241.
10. ЗДА у г. Полацку. – Фонд 658. – Воп. 6. – Спр. 935.
11. ЗДА у г. Полацку. – Фонд 658. – Воп. 6. – Спр. 965.
12. ЗДА у г. Полацку. – Фонд 1439. – Воп. 5. – Спр. 100.
13. ЗДА у г. Полацку. – Фонд 1221. – Воп. 1. – Спр. 7.
14. ЗДА у г. Полацку. – Фонд 1221. – Воп. 1. – Спр. 10.
15. Кулагін, А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі / А.М. Кулагін. – Мінск: БелЭн, 2001. – 328 с.
16. Лабоха, Г.М. Гісторыя заснавання і развіцця Свята-Крыжаўзвіжанскага храма як асноўнай складаючай Спаса-Еўфрасіннеўскага манастырскага комплексу / Г.М. Лабоха // Труды молодых спец. Полоц. гос. ун-та. Вып. 28. – 2008. – С. 15 – 19.
17. Лаврецкий, Г.М. Православное зодчество Беларуси / Г.М. Лаврецкий. – Минск: Четыре четверти, 1995. – 104 с.
18. Лакотка, А.І. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры / А.І. Лакотка. – Мінск: Ураджай, 1999. – 366 с.
19. Монастырь у церкви Спаса: Полоцкий Спасо-Евфросиниевский монастырь с древности до наших дней. – Минск: Орех, 2007. – 136 с.
20. Пішчулёнак, М. Ціхі прытулак, або чацвёртае адраджэнне: Аб гісторыі Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага жаночага манастыра / М. Пішчулёнак // Беларуская мінуўшчына. – 1995. – № 6. – С. 26 – 29.
21. Пішчулёнак, М. Становішча праваслаўнай царквы на Віцебшчыне ў 1917 – 1990 гадах / М. Пішчулёнак // Беларускі горад у часе і прасторы: 500 гадоў Полацкай магдэбургіі: зб. навук. прац. – Наваполацк: ПДУ, 2001.
22. Православная церковь на Витебщине (1918 – 1991 гг.): документы и материалы / редкол. М.В. Пищулёнок [и др.]. – Минск: НАРБ, 2006. – 365 с.
23. Православные монастыри на Беларуси. – Минск: Четыре четверти, 2003. – 200 с.
24. Старкова, Н. Полоцкий женский монастырь в XIX веке / Н. Старкова // Беларускі горад у часе і прасторы: 500 гадоў Полацкай магдэбургіі: зб. навук. прац. – Наваполацк: ПДУ, 2001. – С. 252 – 258.
25. Храмы и монастыри Полоцкой епархии. – Новополоцк: О.В. Молодечкин, 2006. – 76 с.
26. Шейкин, Г.Н. Полоцкая епархия: Историко-статистическое обозрение / Г.Н. Шейкин. – Минск: Белорусское православное братство трех виленских мучеников, 1997. – 96 с.


*Паступіў 15.03.2010*

## ORTHODOX CHURCHES DEVOTED TO ST. EUPHROSINIA: COMPARATIVE ANALYSIS OF CONDITIONS OF EXISTENCE AND DEVELOPMENT

***G. LABOCHA***

*Comparative analysis concerns St. Euphrosinia's church in Borovka village Verhnedvinsk area and strictly 'Warm' church that was built in border of the architectural ensemble of Polotsk female monastery. Comparative analysis of existence and activity of chosen temples is organized in retrospection of time. The composite-artistic features and particularities of the constructive solution of churches are considered. Stylistic direction of Orthodox temples and degree of their influence upon exterior and organization are determined. The article although deals with conditions and specifics of existence these sacral monuments. Short excursus of modern position of the conventual complex is brought for more detailed comparative analysis of the epoch in its existence.*